


20.10.2020 - ГОМЕЛЬШЧЫНА, Рэгіёны

# Ішоў па горадзе майстар

**Пад такой назвай 17 кастрычніка аддзел турызму і краязнаўства Гомельскага гарадскога цэнтра дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі і філіял Веткаўскага музея стараверства і беларускіх традыцый імя Ф.Г.Шклярава правялі гарадскі квест для навучэнцаў гомельскіх школ.**




Нягледзячы на пераменлівае надвор’е, у гульні прынялі ўдзел 40 каманд, у якія ўвайшлі 170 хлопцаў і дзяўчат.

Гульня стала займальным падарожжам у свет архітэктуры роднага горада і была прысвечана

знакамітаму гомельскаму архітэктару Станіславу Данілавічу Шабунеўскаму.

Полем гульні стаў Гомель: яго будынкі, вуліцы і аб’екты гарадской інфраструктуры. Каманды на старце атрымалі ліст заданняў. Удзельнікам неабходна было не толькі знайсці самі будынкі, але і зрабіць каманднае фота на іх фоне, адказаць на шэраг пытанняў і нават паспаборнічаць у майстэрстве чарчэння элементаў будынкаў.







Арганізатары гульні зрабілі невялікі бонус удзельнікам – квест стартаваў у сценах музея, а дакладней – у зале, прысвечанай спадчыне архітэктара.







Гульня праходзіла ў дзвюх узроставых катэгорыях: 7–8 і 9–11 класы. Таксама быў праведзены дадатковы творчы конкурс “Крэатыўнае фота каманды”. Пры вызначэнні пераможцаў журы зыходзіла з дакладнасці выканання задання, хуткасці праходжання маршруту і дакладнай перадачы характэрных прыкмет будынкаў.



Пераможцай сярод 7–8 класаў стала каманда сярэдняй школы № 9 Гомеля; у каманд сярэдняй школы № 30 і сярэдняй школы № 25 – адпаведна другое і трэцяе месцы.

Сярод 9–11 класаў у лідарах – гульцы з ясляў-сада – сярэдняй школы № 73; на другім месцы апынулася каманда сярэдняй школы № 26, а на трэцім –каманда сярэдняй школы № 2.

У конкурсе “Крэатыўнае фота каманды” перамаглі каманды сярэдніх школ Гомеля № 57, 29 і 22.

**Людміла ПРЫСКОКА,**
**загадчык аддзела турызму і краязнаўства**
**Гомельскага гарадскога цэнтра**
**дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі**